Л. М. Боханка

# *Арфаграфічны трэнажор*

# па БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

## 4 клас

*Дапаможнік для настаўнікаў*
*устаноў агульнай сярэдняй адукацыі*

Мазыр
«Выснова»
2022

# Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа

Члены сказа, якія адказваюць на адно і тое ж пытанне і звязаны па сэнсе з адным і тым жа словам, называюцца *аднароднымі*.

Аднароднымі могуць быць:
**дзейнікі:** *Рыжыкі, баравікі, лісічкі прынеслі ў кошыках з лесу.*
**выказнікі:** *На перапынках у школе дзеці гуляюць, адпачываюць.*
**даданыя члены сказа:** *Людзі гулялі па плошчы, па парку.*

На пісьме паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска: *Бліснула яркая, асляпляльная маланка.*
Аднародныя члены сказа могуць быць звязаны паміж сабой з дапамогай слоў *і, а, але.*
Перад словам *і*, калі яно ўжываецца ў сказе адзін раз, коска не ставіцца: *У добрай гаспадарыні ёсць сала і масла ў скрыні.*
Калі словы *і (ці, або)* паўтараюцца ў сказе некалькі разоў, коска паміж аднароднымі членамі перад словамі *і (ці, або)* ставіцца: *На канікулах дзеці наведаюць і тэатр, і музей, і выставу.*
Перад словамі *а, але* заўсёды ставіцца коска:
*Каля дома ёсць невялікі, але ўтульны двор.*
*Вавёрачка пераскочыла на суседняе дрэва, а хутка і зусім знікла з вачэй.*

**Прачытай. Устаў, дзе трэба, прапушчаныя знакі прыпынку.**

1. Колькі цудоўных рэчаў зрабілі ўмелыя старанныя працавітыя рукі!
2. Рукі сялян вырошчваюць бульбу жыта пшаніцу капусту.
3. У садзе спеюць яблыкі і грушы.
4. Зімой ягады рабіны салодкія сакавітыя.
5. Марыя была ўдзячная сяброўкам за ўвагу і дапамогу.
6. Снег яшчэ не пачарнеў а толькі асеў.
7. Кожнае пакаленне павінна паважаць і берагчы хлеб.
8. Перад навальніцай усё жывое ў лесе змоўкла заціхла.
9. Волечка пісала літары хутка але не вельмі прыгожа.
10. Прыйшоў май і пабяліў увесь сад.

***

1. На паляванне мы пайшлі раніцай а вярнуліся позна вечарам.
2. Лена спачатку вымыла посуд а потым падмяла падлогу.
3. Лёд затрашчаў і прагнуўся пад нагамі.
4. Дзяўчынка не сядзела на месцы а гуляла ў жмуркі разам з сяброўкамі.
5. Старажытныя жыхары Беларусі сеялі жыта ячмень авёс проса грэчку лён і каноплі.

6. У садах спеюць яблыкі грушы слівы вішні.

7. Два браты ў ваду глядзяць а разам не сыходзяцца.

8. Нашы продкі былі людзі дружныя і працавітыя.

9. Летам я загараў купаўся плаваў на лодцы.

10. Гучную песню зязюлі можна пачуць і ранкам і днём і надвячоркам.

*Зязюля* — лясная пералётная птушка (*рус.* кукукушка).

***

1. У лесе рос стары магутны дуб.

2. У заапарку мы бачылі слана тыгра зубра мядзведзя.

3. Дзеці ў школе чытаюць пішуць рашаюць задачы.

4. Ласі і касулі скідаюць свае прыгожыя рогі ў снежні.

5. Хлопчыкі і дзяўчынкі спяшаюцца ў школу.

6. Маладая варона каркнула і раскрыла дзюбу.

7. На парадзе дзеці бачылі самалёты верталёты танкі.

8. Спелыя яблыкі і грушы падаюць на зямлю.

9. Блішчаць пераліваюцца кропелькі расы.

10. Моцны вецер калыша дрэвы і кусты.

***

1. Удзень адпачывае а ўночы лётае.

2. Хоць зубоў не мае а балюча кусае.

3. У беларускіх лясах водзяцца вавёркі лісы ваўкі зайцы.

4. Не есць не п’е а ходзіць і б’е.

5. У цяпле масла мяса малако хутка псуюцца.

сябрую — ____________________

кармлю — ____________________

**6.** Начаплю — ____________________

павучаю — ____________________

павітаю — ____________________

павячэраю — ____________________

падарожнічаю — ____________________

падлічу — ____________________

пазіраю — ____________________

стаю — ____________________

мыю — ____________________

пазычу — ____________________

*Пазы́чыць* — даць у доўг (одолжить).

**7.** Пішу — ____________________

гавару — ____________________

пакульгаю — ____________________

парушаю — ____________________

перакажу — ____________________

ператвару — ____________________

праглыну — ____________________

разаб'ю — ____________________

кладу — ____________________

**8.** Разварушу — ____________________

раскапаю — ____________________

утвару — ____________________

заўважу — ____________________

сяджу — ____________________

сплю — ____________________

вязу — ____________________

нясу — ____________________

страчу — ____________________

## Слоўнікавыя словы

**Прачытай. Устаў прапушчаныя літары.**

Ахво́...на, паштал...ён, гр...ме́ць, ле́дз...ве, ...ле́тку, б...рэ́т, т...л...гра́ма, бал...ры́на, пл...ве́ц, сё...я, с...ку́нда, гара...а́не, памо́...нік, з...я́ць, ...у́ліца, цв...сці́, чац...вёрты, д...л...га́цыя, ...слы́х, ап...ты́т, ...ні́зе, по́...піс, да пабачэ́...я, ме́н...шы, аб...язджа́ць, ...ве́рсе.

**Выправі, дзе трэба, памылкі ў напісанні слоў.**

Гаражане, сякунда, сёння, пловец, уліца, цвесці, дэлегацыя, чацьвёрты, у слых, балярына, потпіс, уверсе, памошнік, ахвотна, у нізе, тэлеграма, бярэт, ледзьве, зяць, паштальён, меньшы, улетку, апятыт, да пабачэння, грімець, абьязджаць.



Зак. 191/2712880-1.